# 3 ЭВАЛЮЦЫЯ ГЕНДАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У СВЕЦЕ

1 Тэарэтычныя напрацоўкі І.Шаберт і Р. Хоф у галіне гендарных даследаванняў.
2 Гендар як «нявызначаная пераменная», якая ўдакладняецца часам, прасторай, культурным кантэкстам (Дж.Батлер).
3 Сацыяльная тэорыя гендарнай стратыфікацыі Дж.Хубер.

## 1 Тэарэтычныя напрацоўкі І.Шаберт і Р. Хоф у галіне гендарных даследаванняў.

*а) праблематыка традыцыйнага напісання гісторыі літаратуры*

Свой уклад у развіццё тэорыі гендара зрабілі нямецкія навукоўцы. Так, **І.Шаберт** у артыкуле «Гендар як катэгорыя новай гісторыі літаратуры» даводзіць, што любая гісторыяграфія ў значнай ступені вызначаецца поглядамі таго, хто піша, а таксама формамі прадстаўлення, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні. «Пры гэтым на вобраз бачання гістарыёграфа накладваюць адбітак не столькі асабістыя, колькі тыповыя для яго часу ці пэўнай групы людзей схемы ўспрымання. Спосаб прадстаўлення гістарычных падзей асабліва залежыць таксама ад надіндывідуальных норм навуковых дыскурсаў». Шматлікія работы па тэорыі гісторыяграфіі даказваюць гэта, робіць выснову даследчыца, і робяць відавочным той факт, што «гісторыя», якая з'яўляецца ўсяго толькі адной з версій гісторыі, мае патрэбу ў паслядоўным пераглядзе. Гэта, безумоўна, тычыцца і гісторыі літаратуры. Знаёмыя карціны мінулага літаратуры з іх падзелам на эпохі, іерархіяй твораў, накірункамі і кантэкстуальнымі ўзорамі павінны пастаянна падпадаць пад крытычную пераправерку і абнаўленне (крытыкавацца і абнаўляцца). Інакш яны не будуць адпавядаць актуальнаму ўзроўню ведаў у літаратуразнаўстве. Перад такой альтэрнатывай апынуліся на сённяшні дзень Gender Studies (гендарныя даследаванні), з пазіцый якіх традыцыйныя працы па гісторыі літаратуры можна толькі «тактоўна ігнараваць» або уключыць іх у праграму, па словах Дж.Фэтэрлей, «супрацiўляльнага чытання».

Далей аўтарка зазначае, што ў сваёй большасці працы па гісторыі літаратуры ствараліся ў тыя часы, калі значэнне адрознівання полаў у літаратурным жыцці і літаратуразнаўстве яшчэ не было ў дастатковай ступені асэнсавана. Ігнараванне катэгорыі «гендар» прывяло да таго, што «мужчынскае» – мужчынскія нормы паэтыкі, мужчынскія спосабы пісьма, мужчынскія і жаночыя вобразы, якія стварылі мужчыны, – прыраўноўвалася да «агульначалавечага», у той час як характэрная жаночая прысутнасць проста не заўважалася. Аўтары такіх работ, як правіла, праецыруюць агульнапрынятыя пола-ролевыя стэрэатыпы на аб'ект, які даследуюць. «Такім культуральным стэрэатыпам у літаратуры з'яўляецца вызначэнне пішучага суб'екта як «мужчынскага», у той час як пазіцыя апісваемага аб'екта канатуецца з «жаночым». Гэты стэрэатып, з аднаго боку, пастаянна даваў прывілеі аўтарам-мужчынам, спрыяў іх літаратурнай дзейнасці і выданню іх твораў. З другога боку, такі стэрэатып з тым самым пастаянствам ускладняў літаратурную дзейнасць жанчын. Да таго ж у многім вызначаў і ўспрыняцце гістарычнага працэсу напісання і прачытання твораў. Калі мастацкае пісьмо з'яўляецца мужчынскім, то і гісторыя літаратуры павінна быць гісторыяй аўтараў-мужчын. Жанчын, якія пішуць, ігнаруюць ці адводзяць ім месца на заднім плане (як паказвае прагляд практычна любой гісторыі літаратуры). Пры гэтым заўважаецца пагарджанне і прадузятасць у адносінах да літаратурнай дзейнасці жанчын, а таксама імкненне ацэньваць іх пісьмо адносна мужчынскіх літаратурных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дасягненняў.

Мы пагаджаемся са слушнымі заўвагамі даследчыцы, аднак наконт беларускай літаратуры зазначым наступнае: у апошні час актыўна вяртаецца спадчына жанчын-аўтараў мінулых стагоддзяў. Праўда, гэта звязана не столькі з асэнсаваннем гендарных праблем у літаратуры і літаратуразнаўстве, колькі з своеасаблівасцю гістарычнага развіцця нашай краіны. Бо многія этнічныя беларусы карысталіся польскай або рускай мовамі і таму сталі набыткам іншых культур. Што да развіцця беларускага прыгожага пісьменства на сучасным этапе, то жанчыны-аўтары займаюць у ім належнае месца і ў колькасным, і ў якасным плане. Гэта тычыцца не толькі жаночага аўтарства, а і стылю пісьма, выяўленню жаночай самасці.

*б) гістарычнасць паняцця полу*

І.Шаберт звяртае ўвагу на той факт, што «азначэнне мужчыны і жанчыны, адрозненні паміж жаноцкасцю і мужчынскасцю змяняюцца з цягам часу. Разнастайныя ўяўленні існуюць адначасна, набываючы большую або меншую значнасць; іх камбінуюць, суадносяць адно з другім, каб праз адрозненні паміж поламі даць характарыстыкі чалавека ўвогуле. Усведамленне факта гэтых гістарычных змен адбылося зусім нядаўна. Доўгі час лічылася, што значэнні слоў у гэтай вобласці застаюцца нязменнымі».

Даследчыца ж падкрэслівае, што «гісторыя літаратуры выяўляе падвойную сувязь з гістарычнай дынамікай паняцця полу. З аднаго боку, літаратура ў сваіх канцэптах чалавека дакументуе ўяўленні пра мужчынскае і жаночае, якія ўвесь час змяняюцца, а аўтары – мужчыны і жанчыны – ідэнтыфікуюць сябе з пэўнымі спецыфічна мужчынскімі ці жаночымі нормамі пісьма і спрабуюць адпавядаць абумоўленым часам нормам успрымання полаў уяўных чытача і чытачкі. З другога боку, літаратурныя творы актыўна садзейнічалі змене ўяўленняў пра характар полаў» [166, 112]. Даследаванні па гісторыі літаратуры, безумоўна, павінны ўлічваць існаванне дзвюх гэтых тэндэнцый: і змену літаратуры пад уплывам новых канцэптаў распазнавання полаў, і змяненне саміх канцэптаў пад уплывам новых літаратурных мадэляў жаночага і мужчынскага.

Гендарныя даследаванні, што вывучаюць суадносіны полаў, тлумачыць **Р. Хоф** у артыкуле «Узнікненне і развіццё гендарных даследаванняў» [155], з'яўляюцца лагічным следствам жаночых даследаванняў. З гэтага пункту гледжання патрабаванне прызнання «суадносін полаў» у якасці фундаментальнай катэгорыі аналізу не можа абмяркоўвацца незалежна ад грамадска-палітычных, сацыяльных і інстытуцыянальных умоў, лічыць даследчыца. З другога боку, неабходна удакладніць адрозненні паміж жаночымі і гендарнымі даследаваннямі і вызначыць той даследчы інтарэс, які адрознівае гендарныя даследаванні ад шматвяковай «філасофіі полаў», што развівалі пераважна мужчыны, так і ад распрацаванага ў XX ст. канцэпта «полавых ролей».

Для жаночых даследаванняў на першым этапе важна было назваць адрозненні паміж жанчынамі і мужчынамі. Галоўная задача была ў тым, каб прадставіць інфармацыю ад жанчын і пра жанчын, каб такім чынам стварыць фундамент для новых тэарэтычных пабудоў. З гэтага моманту пачынаецца задача гендарных даследаванняў, у якіх гаворка ідзе не столькі пра працяг крытыкі (цяпер ужо і без таго вядомага) высвятлення жанчын і не столькі пра механізмы, што раней адназначна прыпісваліся ўладзе, колькі пра крытычны аналіз механізмаў, звязаных з іерархізацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пры адрозніваннях паміж жаночымі і гендарнымі даследаваннямі, сцвярджае Р.Хоф, гаворка ідзе не пра дакладнае размежаванне, а, хутчэй, пра перастаноўку акцэнта, пры якой многія, арыентаваныя спачатку пераважна на ўмовы жыцця і работу жанчын даследаванні, былі ўключаны ў больш шырокі кантэкст. Катэгорыя гендара тлумачыць, што ўключэнне жаночых даследаванняў у тэарэтычныя веды не абмяжоўваецца ўключэннем ведаў пра жанчын і вопыту жанчын у тую ці іншую навуковую галіну. Наадварот, на аснове гэтых новых ведаў павінны змяніцца ўзаемасувязі аргументаў і абгрунтаванняў унутры адпаведнай дысцыпліны.

Гендарныя даследаванні, найперш, крытыкуюць агульнасць жаночага вопыту і акцэнтуюць увагу на розніцы паміж самімі жанчынамі. Адрозненні па прыкмеце полу ў параўнанні з такімі катэгорыямі, як раса, клас, узрост, сексуальная арыентацыя, губляюць сваю актуальнасць. Таму важнымі для даследчыкаў у гэты час робяцца напрацоўкі постструктуралістаў (М.Фуко, Ж.Дэрыда і інш.). «Замест таго, каб зыходзіць з зададзеных адрозненняў паміж жаночым і мужчынскім, гэтае паняцце прымушае нас задумацца над *значэннем*, што прыпісваецца гэтым адрозненням» [159, 38]. Бо і жаноцкасць, і мужчынскасць, што часта разглядаюцца як нязменны факт, з’яўляюцца культурным канструктам, а значыць, здольныя змяняцца. Акрамя таго, з гэтага ў выніку паўстае наступнае (больш складанае) пытанне: «з дапамогай якіх крытэрыяў выбару ўвогуле ацэньваецца рэлевантнасць (сэнсавая адпаведнасць паміж інфармацыйным запатрабаваннем і атрыманым паведамленнем – Т.Ф.) фактаў і падзей. Гэтае пытанне, у якасці агульнай тэарэтычнай праблемы, тычыцца не толькі жаночых даследаванняў, яно звязваецца, хутчэй, з усёй галіной вытворчасці ведаў».

Р.Хоф сцвярджае, што спроба сцвердзіць гендар у якасці асноўнай навуковай катэгорыі мела чатыры абгрунтаванні:

– з мэтай адказу ад прычыннай залежнасці паміж жаночым і мужчынскім целам і вызначанымі грамадскімі ролямі, якая прымаецца за натуральную;

– у мэтах наладжвання сувязей паміж структурай адносін полаў і іншымі ўнутрыкультурнымі кантэкстамі і формамі грамадскай арганізацыі;

– у выніку прызнання таго факта, што грамадская арганізацыя, у якой мужчыны і жанчыны адыгрываюць пэўную ролю, не можа быць зразумелай без аналізу адпаведных уладных сістэм;

– як следства перакanання, што працэс адрознівання, які вядзе да розных ролей, таксама павінен быць прааналізаваны.

Той факт, што жаночыя даследаванні і феміністская навуковая крытыка абавязаны сваім узнікненнем сацыяльнаму руху, а не тэарэтычнаму развіццю ўнутры самой навукі, тлумачыць спецыфічную дынаміку ўтварэння тэорыі, якая паспрыяла пераходу ад жаночых да гендарных даследаванняў, заўважае даследчыца. Увядзенне гендара як аналітычнай катэгорыі давала магчымасць дэканструкцыі апазіцыі паміж мужчынамі і жанчынамі (што была пад пытаннем) і адначасна сур’ёзных адносін да гэтай апазіцыі як да механізма іерархізацыі ў сацыяльнай, культурнай і палітычнай рэальнасці. З дапамогай гэтай аналітычнай катэгорыі ажыццёўлена спроба апісаць феномен суадносін улады паміж поламі без звароту да пастулата агульнага жаночага вопыту ці універсальнага прыгнёту жанчын, які стаў праблематычным.

Р.Хоф далей падкрэслівае важнасць патрабавання зразумець, што інтэрпрэтатыўная гісторыя адрознівання полаў, якая першай зрабіла спробу канстытуяваць суадносіны полаў, сама з’яўляецца часткай «сацыяльнага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канструявання рэальнасці». Гэта неабходна для таго, каб такім чынам ажыццявіць аналіз узаемадзеяння паміж гэтай гісторыяй і іншымі грамадскімі арганізацыйнымі структурамі.

**2 Гендар як «нявызначаная пераменная», якая ўдакладняецца часам, прасторай, культурным кантэкстам (Дж.Батлер).**

Гендар як «нявызначаная пераменная» – упершыню такім чынам ахарактарызавала гендар тэарэтык фемінізма, прафесар Каліфарнійскага універсітэта **Джудзіт Батлер** у артыкуле «Гендарныя турботы». Яе філасофская пазіцыя грунтуецца на пераасэнсаванні дэканструктывісцкай і постструктуралісцкай праблематыкі. Не выпадкова даследчыцай у згаданай рабоце надаецца вялікая ўвага паняццям рэпрэзентацыі і мовы, заснаваных на аналізе дыскурсіўных асноў палітыкі рэпрэзентацыі гендара ў сучасным грамадстве.

«Гендарныя турботы» – гэта генеалогія зацягнутай спрэчкі пра Імя і дыскурсіўныя асновы самога фемінізму, пра тое, што папярэднічае пазначванню. Гэта спроба дэканструкцыі азначэння прадмета фемінізму «як устойлівага, які пазначаецца адзіным паняццем «жанчыны». Дж.Батлер звяртаецца тут да вельмі актуальнай праблемы множнасці сэнсаў, што ахопліваецца паняццямі «жанчына», «гендар», «пол», бо ў выніку гэта адкрывае новую перспектыву для феміністскіх і гендарных даследаванняў.

Падыход, у адпаведнасці з якім жанчыны ўспрымаюцца як група, якую адрозніваюць агульныя прыкметы і інтарэсы, на яе думку, узмацніў бінарызм заходняй культуры: «Замест таго, каб выконваць ролю ўстойлівага пазначальнага,.. паняцце жанчыны, нават узятае ў множным ліку, само аказалася супярэчлівым тэрмінам, прадметам спрэчак, прычынай турбот». Увогуле, лічыць даследчыца, падзел чалавецтва на мужчын і жанчын не з'яўляецца адзіным спосабам тлумачэння пабудовы грамадства і культуры. Фемінізм, на яе думку, пазбавіў сябе магчымасці фармавання множных і больш разнастайных ідэнтычнасцей, калі аб'яднаў усіх жанчын «пад парасонам» універсалізму і адзінства катэгорыі «жанчына». Постфемінізм, наадварот, імкнецца быць менш радыкальным і больш крытычным у адносінах да сваіх асноў. Ён выражае справядлівае сумненне ва універсальнасці сваіх тэзісаў і агульназразумеласці пазначальных.

Для Дж.Батлер не толькі «гендар», але і «пол» з'яўляецца культурным канструктам. Пры гэтым і першае, і другое – прадукты рэалізацыі стратэгій улады. Далей у рабоце даследчыца робіць выснову, што «гендар» з'яўляецца «нявызначанай пераменнай», якая ўдакладняецца часам, прасторай, культурным кантэкстам. Да таго ж гэтая катэгорыя не выяўляе нейкую ўнутраную сутнасць, што папярэднічае з'яўленню, а сцвярджае сябе ў самім акце прадстаўлення: «Не існуе гендарнай ідэнтычнасці да і па-за праяўленнямі гендара; гэтая ідэнтычнасць перфарматыўна канстытуіруецца тымі яе «праяўленнямі», якія лічацца вынікам яе існавання». Паняцце «жанчыны», на думку Дж.Батлер, ёсць ідэнтычнасць без сутнасці.

**3 Сацыяльная тэорыя гендарнай стратыфікацыі Дж.Хубер.**

Памятаючы, што гендарныя даследаванні міждысцыплінарныя, звернемся да напрацовак сацыёлага і антраполага **Дж.Хубер**. Яна вядомая тым, што распрацавала тэорыю гендарнай стратыфікацыі, якая з'яўляецца падсістэмай сацыяльнай стратыфікацыі і можа даць адказ на многія пытанні, што тычацца

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

вытворчасці і размеркавання эканамічных рэсурсаў і рэгулявання сексуальнасці. Для нас названая тэорыя карысная тым, што дае магчымасць па іншаму глянуць на ўзаемадачыненні герояў твораў, якія ў сваю чаргу з'яўляюцца адбіткам ўзаемаадносін полаў у грамадстве і адначасова ўзнаўляльнікамі стэрэатыпаў паводзін полаў. Мы будзем звяртацца да тэорыі Дж.Хубер пры аналізе мастацкіх твораў беларускай літаратуры яшчэ і таму, што тэорыя гендарнай стратыфікацыі дапамагае зразумець наступнае – адрозненні паміж жанчынамі («жаноцкасці», пра якія гаварыла Дж.Батлер і, безумоўна, «мужчынскасці») абумоўліваюцца расавай, этнічнай, класавай прыналежнасцю. На іх ўплывае гістарычны час, узрост, адукацыя, нават знешнасць (што больш суадносіцца з успрыняццем жанчын).

Шматлікія тэорыі, якія тлумачаць адрозненні і няроўнасць полаў, на думку Дж.Хубер, падзяляюцца на дзве школы: біягенетычную і біякультурную. Першая абгрунтоўвае адрозненні ў паводзінах мужчын і жанчын біялагічнымі і генетычнымі фактарамі: памеры цела, моц, рознасць у развіцці правага або левага паўшар'яў мозгу і г.д. Пры гэтым некаторыя навукоўцы лічаць гэтыя адрозненні, а разам з імі і мужчынскае дамінаванне, спрадвечнымі. Іншыя ж – сфармаванымі ў працэсе эвалюцыі, але усё роўна непазбежнымі і неабходнымі для выжывання віду. Другая, біякультурная, школа ўказвае на вялікую варыятыўнасць сацыяполавых паводзін і падзелу працы. Такая разнастайнасць культурных адаптацый настолькі вялікая, што яе нельга патлумачыць толькі біялагічнымі фактарамі. Пазней навукоўцы ўсвядомілі, «што гендарная стратыфікацыя з'яўляецца формай сацыяльнай стратыфікацыі, у якую біялогія зрабіла значны ўклад, але якую нельга патлумачыць зыходзячы толькі з біялогіі». Дж.Хубер у сваёй тэорыі змяшчае гендарную стратыфікацыю ў кантэкст універсальнай сацыяльнай стратыфікацыі і падзелу працы. Такія спробы рабіліся і раней, найбольш вядомая з іх – работа Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы». Аўтар матывуе стварэнне сістэмы прыгнёту жанчын імкненнем да перадачы ўласнасці бясспрэчнаму спадкаемцу. Механізм, які быў выпрацаваны для рэалізацыі гэтай мэты, заключаўся ў кантролі над жаночымі паводзінамі, што паступова прывяло да ўстанаўлення манагамнага (для жанчыны) шлюбу. Згодна з Энгельсам, падзел працы па прыкмеце полу існаваў заўсёды, але пачаў мець значэнне толькі са з'яўленнем прыватнай уласнасці. Праца, якую выконвалі мужчыны, з'яўлялася вытворчай і валодала менавой каштоўнасцю. Жаночая ж праца (вядзенне хатняй гаспадаркі і догляд дзяцей) яе не мела, хоць была неабходнай для выжывання. Жаночы ўклад, такім чынам, быў абясцэнены. Дж.Хубер лічыць, што Энгельс здзейсніў прарыў, калі ўключыў сексуальнасць і рэпрадукцыю ў эканамічную тэорыю. Аднак гэтая тэорыя ўсё ж не тлумачыць самога факта полавага падзелу працы.

Даследчыца распрацавала мадэль гендарнай (сацыяльна-полавай) стратыфікацыі з улікам таго, што адбываецца ўнутры хатняй гаспадаркі, а таксама тых дзвюх задач узнаўлення, рашэнне якіх недаступна мужчынам: нараджэнне і кармленне малаком маці, – і вылучыла тры прынцыпы гэтай тэорыі:

1) «людзі, занятыя ў вытворчасці тавараў, маюць больш улады і прэстыжу, чым тыя, што спажываюць: лепш валодаць здольнасцю даваць, чым браць»;

2) «работа, што выконваецца жанчынамі, павінна сумяшчацца з цяжарнасцю і лактацыяй, калі патрабуецца узнаўленне папуляцыі»;

3) «у любым грамадстве найбольшая ўлада і прэстыж належаць людзям, якія кантралююць размеркаванне матэрыяльных каштоўнасцей па-за сям'ёй. У

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

першабытных грамадствах гэта былі паляўнічыя, у сельскагаспадарчых – воінская знаць, а ў індустрыяльных – вярхі палітычнай, эканамічнай і ваеннай бюракратыі».

На аснове аналізу пяці тыпаў культур аўтар сцвярджае, што становішча жанчыны непасрэдна звязана з яе ўдзелам у вытворчасці ежы, аднак у некаторых грамадствах патрэба ва ўзнаўленні насельніцтва поўнасцю выключае жанчын з дзейнасці, якая дае ўладу і прэстыж. Гэта адбываецца там, дзе вытворчасць ежы патрабуе доўгага знаходжання па-за домам, альбо калі вайна становіцца адным са значных спосабаў павелічэння «лішкаў». Пры гэтым даследчыца звяртае ўвагу на шлюб і структуру сям'і, а таксама бярэ пад увагу дэмаграфічныя тэндэнцыі: смяротнасць, нараджальнасць, узровень разводаў.

Удасканальванне прылад працы, што прыводзіць да павелічэння вытворчасці ежы, а таксама змяненне ўзроўню нараджальнасці і смяротнасці непасрэдна звязаны са становішчам жанчын, канстатуе Дж.Хубер. Таму ў постіндустрыяльную эпоху статус жанчын павышаецца. Іх становішча паляпшаецца па той прычыне, што развіццё тэхналогій робіць фізічныя адрозненні паміж поламі менш значнымі. Аднак важную ролю працягвае адыгрываць унутрысямейны падзел працы. І менавіта палеміка пра хатнюю гаспадарку, што з'яўляецца вядучай у сацыялогіі, дапамагла давесці, што адносіны ў сям'і будуюцца на эканамічнай аснове. «Хатняя праца для гендарнай стратыфікацыі ёсць тое ж самае, што для класавай – рынак. Жанчыны да той пары не займеюць роўнасці з мужчынамі, пакуль найбольш адораныя з іх не змогуць спадзявацца на рэалізацыю свайго таленту з такой жа доляй упэўненасці, як і мужчыны», – зазначае аўтар напрыканцы артыкула і раіць падзяліць пароўну хатнюю работу, бо яна з'яўляецца цудоўным фізічным практыкаваннем і паляпшае псіхічнае здароўе.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ